**24.** Словы *шпарка – імклівая* з’яўляюцца … .

**А)** сінонімамі. **Б)** антонімамі. **В)** паронімамі. **Г)** амонімамі. **Д)** амафонамі.

---

**25.** Дадзены сказы:

*1. Рос Сымонка_ як гарох пры дарозе.*

*2. Шмат якія стравы можна прыгатаваць з выкарыстаннем свежых_ сушаных і вараных ягад.*

*3. Над вадой ля берага звісалі галінкі вярбы_ а ўздоўж разраслася лаза.*

У якіх сказах на месцы пропуску неабходна паставіць коску?

**А)** ва ўсіх сказах. **Б)** няма такіх. **В)** у 1, 2. **Г)** у 1, 3. **Д)** у 2, 3.

---

**26.** Гукапераймальныя словы, як вядома, імітуюць гукі жывой і нежывой прыроды. Якое гукаперайманне належыць змяі?

**А)** сыкаць. **Б)** вуркатаць. **В)** буркаваць. **Г)** гудзець. **Д)** стракатаць.

---

**27.** Вызначце з прапанаваных прыкладаў правільна ўтвораныя словазлучэнні.

*1) не прачытаў ліста; 2) бачыў сваімі вачыма;*

*3) спазніўся праз дождж; 4) па старадаўнім звычаі.*

**А)** усе прыклады. **Б)** няма такіх прыкладаў. **В)** 1, 2. **Г)** 2, 3. **Д)** 3, 4.

---

**28.** З якога твора выраз *“і самы люты звер за дабро дабром дзякуе”*?

**А)** з легенды “Дамавікова ўдзячнасць”.

**Б)** з твора Уладзіміра Караткевіча “Лебядзіны скіт”.

**В)** з твора Яна Баршчэўскага “Вужыная карона”.

**Г)** з народнай казкі “Залаты птах”. **Д)** з легенды “Пестунь”.

---

**29.** У народзе раней падчас гаспадарчых работ прытрымліваліся наступнай прыкметы:

*Бяроза распускаецца – сей …, сады цвітуць – …, каліна цвіце – … .*

Размясціце на адпаведныя месцы прапушчаныя словы:

*1) авёс; 2) грэчку; 3) бульбу; 4) жыта.*

**А)** 1, 2, 3. **Б)** 1, 3, 2. **В)** 1, 3, 4. **Г)** 2, 1, 3. **Д)** 2, 3, 4.

---

**30.** “Беларускім золатам” паэтычна называюць … .

**А)** разьбу па дрэве. **Б)** лозапляценне. **В)** выцінанку.

**Г)** саломапляценне. **Д)** вышыванне.

---

Арганізатар гульні-конкурсу «Буслік» –
Грамадскае аб’яднанне «Інтэлектуальныя спаборніцтвы «Конкурс»
220045, г. Мінск, вул. Яна Чачота, 16 тэл. (017) 375 66 17, 375 36 23
e-mail: info@bakonkurs.by https://bakonkurs.by/ https://конкурс.бел/
Унітарнае прадпрыемства «Выдавецкі цэнтр БА «Конкурс». Заказ 5. Тыраж 14300 экз. Мінск. 2025 г.

# Гульня-конкурс па беларускай мове і літаратуры «БУСЛІК-2025»

*Чацвер, 13 лютага 2025 года*

- працягласць работы над заданнем 1 гадзіна 15 хвілін;
- на кожнае пытанне маецца толькі адзін правільны адказ;
- на старце ўдзельнік атрымлівае авансам 30 балаў;
- кожны правільны адказ адзначаецца трыма, чатырма ці пяццю баламі; колькасць балаў, якія атрымлівае ўдзельнік, адказваючы на пытанне правільна, вызначаецца складанасцю пытання (10 лягчэйшых пытанняў – па 3 балы, 10 найбольш складаных – па 5 балаў, астатнія 10 – па 4 балы); складанасць пытання вызначаецца па колькасці ўдзельнікаў, якія правільна на яго адказалі;
- за няправільны адказ аднімаецца чвэрць балаў, прадугледжаных за дадзенае пытанне, у той час, як не даўшы адказу, удзельнік захоўвае раней набраныя балы;
- максімальная колькасць балаў, якой ацэньваецца заданне конкурсу, – 150, аднак аўтары задання не прадугледжваюць яго поўнага выканання ўдзельнікамі; у заданне гульні-конкурсу ўключаны пытанні, веды пра якія не прадугледжаны школьнай праграмай;
- карыстацца даведнікамі, падручнікамі, слоўнікамі, іншымі пісьмовымі або друкаванымі матэрыяламі, электроннымі сродкамі інфармацыі і сувязі забараняецца; не дазваляецца таксама абменьвацца інфармацыяй з іншымі ўдзельнікамі і задаваць пытанні настаўніку; ручка, чарнавік, картка і заданне – гэта ўсё, што патрэбна мець удзельніку;
- самастойная і сумленная работа над заданнем – галоўнае патрабаванне арганізатараў да ўдзельнікаў конкурсу;
- пасля заканчэння конкурсу лісток з заданнем і чарнавік удзельнік забірае з сабой і захоўвае іх да падвядзення канчатковых вынікаў;
- вынікі ўдзельнікаў размяшчаюцца на сайце https://bakonkurs.by/ праз 1–2 месяцы пасля правядзення конкурсу.

---

## Заданне для вучняў 7-8 класаў

**1.** Колькі слоў у скорагаворцы?

*Намашынепашашыедзедзедукапелюшы.*

**А)** 5. **Б)** 6. **В)** 7. **Г)** 8. **Д)** 9.

---

**2.** Як называюцца бліны з дранай бульбы?

**А)** калдуны. **Б)** дранікі. **В)** праснакі. **Г)** верашчака. **Д)** саладуха.

---

**3.** Вызначце з прапанаваных адушаўлёныя назоўнікі.

*1) брат; 2) сасна; 3) сусед; 4) раса.*

**А)** усе назоўнікі. **Б)** 1, 2. **В)** 1, 3. **Г)** 2, 3. **Д)** 2, 4.

---

**4.** Якой часцінай мовы з’яўляецца слова *казачны*?

**А)** назоўнікам. **Б)** прыметнікам. **В)** дзеясловам.

**Г)** займеннікам. **Д)** прыслоўем.

---

**5.** Прачытайце вершаваныя радкі Якуба Коласа:

*Вобразы мілыя роднага краю,*
*Смутак і радасць мая!...*

Колькі назоўнікаў у форме адзіночнага ліку ўжыта?

**А)** 0. **Б)** 1. **В)** 2. **Г)** 3. **Д)** 4.

**6.** Дадзена загадка:

*Па моры імчыцца, пад ветрам гуляе, да берага дойдзе – адразу знікае.*

Знайдзіце адгадку ў пераблытаных літарах.

**А)** х, а, я, л, в. **Б)** о, ь, н, к. **В)** р, у, ш, а, н, к. **Г)** е, р, е, ц, в. **Д)** а, ь, т, в, з, р, е.

---

**7.** Які спосаб утварэння назоўніка *лісток*?

**А)** прыставачны. **Б)** суфіксальны. **В)** прыставачна-суфіксальны.
**Г)** бяссуфіксальны. **Д)** асноваскладанне.

---

**8.** Выберыце з прапанаваных дзеясловаў, які з часціцай ***не*** пішацца асобна.

*1) (не)пакоіць; 2) не(даацэньваць); 3) (не)зможа.*

**А)** усе дзеясловы. **Б)** няма такога. **В)** 1. **Г)** 2. **Д)** 3.

---

**9.** Якія словы напісаны правільна?

*1) сжаўцелы; 2) падрыхтаваць; 3) расквечаны; 4) апсадзіць.*

**А)** усе словы. **Б)** няма такіх слоў. **В)** 1, 2. **Г)** 2, 3. **Д)** 3, 4.

---

**10.** Дадзены дзеясловы: *1) наведываю; 2) адгадваю; 3) адыгрываў.*

Які дзеяслоў (дзеясловы) утвораны няправільна?

**А)** усе дзеясловы. **Б)** няма такога. **В)** 1. **Г)** 1, 2. **Д)** 3.

---

**11.** У якіх словах на месцы пропуску напішаце літару ***я***?

*1) м..дуза; 2) л..генда; 3) г..пард; 4) б..нзін.*

**А)** ва ўсіх словах. **Б)** няма такіх. **В)** у 1, 2. **Г)** у 2, 3. **Д)** у 3, 4.

---

**12.** Вызначце з прапанаваных словы, у якіх на канцы вымаўляецца [ц’].

*1) моладзь; 2) дзесяць; 3) медзь.*

**А)** усе словы. **Б)** няма такіх слоў. **В)** 1, 2. **Г)** 1, 3. **Д)** 2, 3.

---

**13.** Як у старажытнасці называлася лодка, а сёння – шахматная фігура?

**А)** ветразь. **Б)** баржа. **В)** карабель. **Г)** пешка. **Д)** ладдзя.

---

**14.** Якім членам сказа з’яўляецца выдзеленае слова?

***Збіраць*** *ягады – прыемны занятак.*

**А)** дзейнікам. **Б)** выказнікам. **В)** дапаўненнем.
**Г)** азначэннем. **Д)** акалічнасцю.

---

**15.** Дадзены сказ: ***Мерна*** *пагойдваліся жоўтыя лісточкі на вадзе.*

Якой часцінай мовы з’яўляецца выдзеленае слова?

**А)** назоўнікам. **Б)** прыметнікам. **В)** дзеясловам.
**Г)** займеннікам. **Д)** прыслоўем.

**16.** У якіх словах на месцы пропуску неабходна напісаць апостраф (’)?

*1) бул..ён; 2) ад..ютант; 3) вераб..іны; 4) галл..ё.*

**А)** ва ўсіх словах. **Б)** няма такіх слоў. **В)** у 1, 3. **Г)** у 2, 3. **Д)** у 2, 4.

---

**17.** Выберыце з прапанаваных няправільна напісаныя словы.

*1) ледзьве; 2) меньш; 3) бясшумны; 4) бясследна.*

**А)** усе словы. **Б)** 1, 2. **В)** 1, 3. **Г)** 2, 3. **Д)** 2, 4.

---

**18.** У народзе існуюць прыкметы:

*а) Ноччу без расы – …; б) З бярозы многа соку – …;*
*в) Вясёлка пасля дажджу – … .*

Прадоўжыце адпаведныя выразы:

*1) да мокрага лета; 2) на добрае надвор’е; 3) дзень з дажджом.*

**А)** а-1, б-2, в-3. **Б)** а-2, б-3, в-1. **В)** а-2, б-1, в-3. **Г)** а-3, б-2, в-1. **Д)** а-3, б-1, в-2.

---

**19.** Які знак прыпынку прапушчаны ў сказе з простай мовай?

*“Галоўнае, сынок, каб ты вырас разумным і выхаваным чалавекам, выбраў прафесію па душы” – сказала маці.*

**А)** коска. **Б)** кропка. **В)** працяжнік. **Г)** двукроп’е. **Д)** двукоссе.

---

**20.** З дадзеных слоў выберыце словы, якія маюць толькі корань і канчатак.

*1) пералёт; 2) перамога; 3) ападкі; 4) гасцінец.*

**А)** усе словы. **Б)** няма такіх слоў. **В)** 1, 2. **Г)** 1, 3. **Д)** 2, 4.

---

**21.** У якіх словах на месцы пропуску напішаце літару ***ы***?

*1) без..менны; 2) дэз..нфекцыя; 3) супер..нтэлект; 4) звыш..мклівы.*

**А)** ва ўсіх словах. **Б)** у 1, 2. **В)** у 1, 3. **Г)** у 2, 3. **Д)** у 2, 4.

---

**22.** Дадзены формы займеннікаў на рускай мове:

*а) некого; б) не с кем; в) не в чем.*

Якія спалучэнні ім адпавядаюць на беларускай мове?

*1) няма з кім; 2) няма ў чым; 3) няма каго.*

**А)** а-1, б-2, в-3. **Б)** а-2, б-3, в-1. **В)** а-2, б-1, в-3.
**Г)** а-3, б-2, в-1. **Д)** а-3, б-1, в-2.

---

**23.** Вызначце з прапанаваных назоўнікі з памяншальна-ласкальнымі суфіксамі, якія правільна напісаны.

*1) яблынка; 2) зямелька; 3) агенчык; 4) песенька.*

**А)** усе назоўнікі. **Б)** няма такіх. **В)** 1, 2. **Г)** 1, 3. **Д)** 2, 4.